Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 ЛІСТАПАДА 2020 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 218 (29332)

ПАВЫСЯЦЦА ПРАЦОЎНЫЯ ПЕНСІІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 409, якім прадугледжваецца пераразлік працоўных пенсій і іх павышэнне з 1 снежня 2020 года.

Згодна з дакументам, працоўныя пенсіі вырастуць у сярэднім на 5,4 % (з Br458,25 у лістападзе гэтага года да Br483 у снежні).

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПАДАРУНКІ КРАІНЕ І ЯЕ ЖЫХАРАМ

Сярод добрых традыцый, якія захаваліся, прыжыліся і трансфармаваліся ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу ў незалежнай краіне Беларусь, — рабіць да дзяржаўных свят падарункі. Фактычна мы робім іх самім сабе і сваёй любімай Радзіме, стваральнай працай умацоўваючы яе моц, імкнучыся да яе росквіту. Кожны год пры падтрымцы дзяржавы напярэдадні дня Кастрычніцкай рэвалюцыі — для беларусаў яна была і застаецца першым важным крокам да нацыянальнага самавызначэння і стварэння ўласнай краіны — адкрываюцца новыя сацыяльныя аб'екты, транспартныя артэрыі, жылыя дамы.

Гэты год, нягледзячы на цяжкасці, якія прынесла і пандэмія, і няпростая сітуацыя ў эканоміцы, і палітычныя хваляванні, не стаў выключэннем. Наадварот — у гэтым лістападзе ў Беларусі адбылося адкрыццё такіх знакавых маштабных аб'ектаў, пра якія многія іншыя краіны нават у нашмат лепшыя часы могуць толькі марыць. І гэта добры знак на тое, што разам мы ўсё пераадолеем, усё вытрымаем. І ўсё ў нас абавязкова будзе добра.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЗАПУСК НОВАЙ ЛІНІІ МЕТРО — ПАКАЗЧЫК САЦЫЯЛЬНАЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ УСТОЙЛІВАСЦІ»

У пятніцу, 6 лістапада, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка адкрыў трэцюю лінію Мінскага метрапалітэна і анансаваў будаўніцтва чацвёртай

«Мы дабудуем трэцюю ветку, на якой можа быць да 17 станцый. І мая мара — можа быць хоць бы распачаць мегапраект па будаўніцтве чацвёртай лініі метрапалітэна — кальцавой, якая разгрузіць Мінскую кальцавую аўтадарогу. Дзякуючы гэтаму ў агляднай перспектыве будуць створаны паўнацэнныя транспартна-перасадачныя вузлы паміж усімі відамі гарадскога і прыгараднага транспарту», — сказаў кіраўнік дзяржавы на цырымоніі адкрыцця.

ШЛЯХ У 37 ГАДОЎ

Будаўніцтва першага ўчастка новай лініі метро (ад станцыі «Кавальская Слабада» да станцыі «Юбілейная плошча») пачалося ў кастрычніку 2013 года з пракладкі інжынерных камунікацый. Яго працягласць 4,4 км, ён уключае чатыры станцыі, перасадачныя вузлы і злучае другую і трэцюю лініі метро. На трэцяй лініі прадугледжаны самыя новыя тэхналагічныя рашэнні, выкарыстоўваецца інтэлектуальная сістэма кіравання цягнікамі, аплаты праезду, пажарнай бяспекі, новыя сродкі перадачы і апрацоўкі інфармацыі аб рабоце ўсіх сістэм метрапалітэна. Асаблівасць новых станцый — платформенная бар'ерная агароджа. Лінія мае цікавыя інтэр'ерныя рашэнні. На станцыі «Кавальская Слабада» ўвасоблены сінтэз сучаснай архітэктуры і нацыянальнай спадчыны. Асноўная мастацкая задума станцыі «Вакзальная» — вобраз дарогі. Інтэр'ер станцыі «Плошча Францішка Багушэвіча» заснаваны на матывах творчасці, эпохі і асяроддзя, у якім працаваў гэты пісьменнік. У афармленні станцыі «Юбілейная плошча» асноўная мэта — стварэнне святочнага настрою.

Фота БелТА.

Фота БелТА.

ISSN 1990 - 763X

СТАР. 3

«ГЭТА ЭТАП СУВЕРЭНІТЭТУ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ НАШАЙ КРАІНЫ»

У суботу, 7 лістапада, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даў дазвол на чарговае павышэнне магутнасці першага рэактара Беларускай атамнай станцыі. Гэты дзень можна лічыць сімвалічным адкрыццём станцыі, што пачынае, па словах кіраўніка дзяржавы, новую эпоху ў гісторыі нашай краіны: яна з гэтага моманту набывае статус ядзернай дзяржавы. Пры гэтым атам у Беларусі будзе выкарыстоўвацца выключна ў мірных мэтах, падкрэсліваe беларускі лідар. Яшчэ адна гарантыя ад яго і тых, хто БелАЭС пабудаваў і абслугоўвае, — бяспека.

ЭНЕРГЕТЫЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

«Гэта гістарычны момант — краіна становіцца ядзернай дзяржавай», — сказаў Прэзідэнт пасля слоў прывітання ў вучэбна-трэніровачным цэнтры Беларускай АЭС, з якога пачынаўся яго візіт на станцыю.

Міністр энергетыкі Віктар Каранкевіч расказаў пра будаўніцтва атамнай станцыі. Тэрмін яе эксплуатацыі — 60 гадоў з магчымасцю працягу да 100 гадоў. Агульны аб'ём вытворчасці і перадачы ў сетку энергіі — 18 мільярдаў кілават-гадзін. У штаце ўжо працуе амаль 2200 чалавек.

У якасці паліва для рэактара выкарыстоўваецца слаба абагачаны дыаксід урану, якія выраблены ў выглядзе таблетак памерам да аднаго сантыметра і вагой пяць грамаў. Такая «таблетка» замяшчае 350 кілаграмаў нафты, 360 кубічных метраў прыроднага газу. Для поўнай загрузкі рэактара неабходна 87 тон такіх таблетак. Поўнасцю такая колькасць паліва адпрацоўваецца чатыры гады.

Пасля гэтага тэрміну ад уранавых таблетак застаецца адпрацаванае ядзернае паліва, якое забіраюць для ўтылізацыі «Расатам». Па словах кіраўніка гэтай карпарацыі Аляксея Ліхачова, яно не лічыцца адходамі — гэта частка замкнутага цыкла і будучае паліва для рэактараў на хуткіх нейтронах, дзе ўран будзе аднаўляцца і зноў трапляць у цеплавыя рэактары.

Перавагі атамнай станцыі — эканомія сродкаў за кошт зніжэння выкарыстання іншых відаў паліва і памяншэнне выкідаў парніковых газаў у атмасферу.

«Гэтага нам ужо хопіць, каб выканаць Парыжскае пагадненне па клімаце?» — спытаў Прэзідэнт.

«Мы значную частку за кошт уводу атамнай станцыі выканаем», — адказаў Віктар Каранкевіч.

Для ўвода энергаблока ў эксплуатацыю неабходна прайсці чатыры этапы. «Мы на першым энергаблоку знаходзімся на трэцім этапе — энергетычны пуск, калі забяспечваецца асваенне магутнасці рэактара да 50 працэнтаў і забяспечваецца сінхранізацыя і ўключэнне ў сетку энергаблока. На БелАЭС першы энергаблок быў сінхранізаваны і ўключаны ў сетку 3 лістапада. З гэтага перыяду забяспечваецца выдача электрычнай энергіі ўсёй беларускай энергасістэме», — расказаў міністр энергетыкі.

Пасля дакладаў пра развіццё энергетычнага комплексу краіны, атамнай энергетыкі і Гродзенскага рэгіёна кіраўнік дзяржавы наведаў будынак турбіны АЭС, дзе яму расказалі аб абсталяванні машыннай залы.

СТАР. 2

«ГЭТА ЭТАП СУВЕРЭНІТЭТУ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ НАШАЙ КРАІНЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт таксама азнаёміўся з пунктам кіравання першым энергаблокам, дзе даў дазвол на пад'ём яго магутнасці да 400 МВт. «Гэта поспех, вянец, можа быць, этап суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны», — так кіраўнік краіны ахарактарызаваў адкрыццё БелАЭС, выступаючы з прамовай на мітынгу перад калектывам станцыі і будаўнікамі.

«У гэты дзень традыцыйна ў перыяд існавання суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны, пакінуўшы свята Вялікага кастрычніка, мы дамовіліся пра яго сэнс — ён у тым, што мы ўзялі з савецкіх часоў усё самае лепшае. І як памятаюць старэйшыя — ***да 7 лістапада мы імкнуліся завяршыць самыя ўдарныя будоўлі, пачатыя ў пяцігодцы, і прынесці нешта, што можа парадаваць людзей»***, — расказаў Прэзідэнт.

Але сёлетні Дзень Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі ён вылучыў асабліва, бо Беларусь становіцца ядзернай дзяржавай. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што марыў аб заснаванні такога аб'екта ў нашай краіне, і значнасць гэтай падзеі народ асэнсуе пазней.

ПАМІЖ ПЕРШАЙ І ДРУГОЙ...

Прэзідэнт прапанаваў пачаць будоўлю яшчэ адной атамнай станцыі ў краіне: «Я паўжартам ужо кажу, калі навучыліся, трэба і другую станцыю пабудаваць. Да таго часу і мы ўбачым, наколькі эфектыўная гэта станцыя, наколькі яна бяспечная, і яна не будзе выклікаць нараканняў у нашых суседзяў і асоб, што сумняваюцца ў нашай краіне».

Ён запэўніў, што нікому не будзе дазволена закрыць «найвялікшы цуд нашай краіны».

На першым энергаблоку БелАЭС будуць выпрацоўваць каля 20 працэнтаў ад агульнай патрэбнасці краіны ў электраэнергіі. Столькі ж дасць дзейнасць другога блока.

«Далей — больш. ***Запуск станцыі паслужыць штуршком для прыцягнення ў краіну самых перадавых тэхналогій. І не толькі ў энергетыку. Але і ў развіццё электратранспарту, стварэнне новых электраёмістых вытворчасцяў, інавацыйных кірункаў у навуцы і адукацыі»***, — пералічыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў прысутным пра меры стымулявання, каб пры ацяпленні дамоў, нагрэву вады, прыгатаванні ежы ўсё больш выкарыстоўваліся электрапрыборы.

«Электрычнасць (чыстая крыніца) павінна прыйсці ў кожную сям'ю, таму нам магчыма мала будзе толькі гэтай станцыі», — аргументаваў Прэзідэнт.

ГАЛОЎНЫ КРЫТЭРЫЙ — БЯСПЕКА

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, беларускі народ больш за ўсіх пацярпеў ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, яе наступствы краіна ўсё яшчэ пераадольвае. Менавіта таму галоўным крытэрыем пры рашэнні аб будаўніцтве была бяспека станцыі, і прыняць рашэнне было няпроста.

Пры выбары праекта АЭС спецыялісты вывучылі прапановы ўсіх сусветных лідараў у гэтай галіне, перагледзелі розныя варыянты — амерыканскі, карэйскі, японскі, французскі, расійскі. Спыніліся на апошнім.

«І не толькі таму, што мы размаўляем з расіянамі на адной мове, не таму што мы народы ад аднаго кораня, а таму што на той перыяд (а сёння яшчэ больш у гэтым упэўнены) гэта быў самы сучасны, самы бяспечны праект, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — І ўжо пасля Фукусімы (у 2011 годзе адбылася буйная радыяцыйная аварыя на японскай АЭС Фукусіма-1. — **«Зв.»**) стала зразумела, у каго лепшы праект».

Сярод пераваг расіян, па фактах Прэзідэнта, не толькі бяспечнасць АЭС, але і кошт.

«Наперадзе ў нас не менш важны этап — вывад на праектную магутнасць першага і ўвод у эксплуатацыю другога энергаблока», — сказаў кіраўнік краіны.

Па словах Прэзідэнта, за кошт пуску станцыі цягам некалькіх дзён эканомія сродкаў для краіны склала адзін мільён долараў.

ШКОЛА ФІЗІКАЎ-ЯДЗЕРШЧЫКАЎ

Прэзідэнт падзякаваў свайму калегу Уладзіміру Пуціну за падтрымку амбіцыйнага праекта і расказаў пра яшчэ адну сваю мару: ***«Я хацеў, каб у нас з'явілася свая школа атамшчыкаў.*** Я прасіў у расіян, каб побач з імі працавалі беларусы. Не толькі будавалі, але і засвоілі асноўныя тэхналагічныя аперацыі».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, кіраўнік «Расатама» яго запэўніў, што беларускія спецыялісты ўжо гатовы будаваць атамныя станцыі па ўсім свеце разам з расіянамі. «Вось, што самае галоўнае — кампетэнцыі. Мы павінны былі навучыцца, як гэта рабіць. Гэта самыя сучасныя тэхналогіі, касмічныя тэхналогіі, і мы гэтаму навучыліся», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў камандзе расійскіх будаўнікоў, мантажнікаў, наладчыкаў, энергетыкаў і персаналу, якія вытрымалі жорсткія патрабаванні беларускіх заказчыкаў станцыі. Прэзідэнт дадаў, што «на БелАЭС будуць працаваць

Фота БелТА.

высакакласныя спецыялісты, якія маюць практычны досвед работы на дзеючых АЭС».

«Як мне дакладваюць, калектыў атамнай станцыі для пуску першага энергаблока сфарміраваны, навучаны і пацвердзіў сваю кваліфікацыю, — паведаміў ён. — Набраны калектыў і для другога энергаблока, засталося зусім няшмат спецыялістаў, але мы іх падрыхтуем і да пуску другога энергаблока набяром столькі, колькі нам трэба».

АСТРАВЕЦ — ПРЫКЛАД РАЗВІЦЦЯ РАЁННЫХ ЦЭНТРАЎ

Астравец пераўтварыўся ў сучасны і зручны горад атамшчыкаў, дадаў Прэзідэнт.

«Пабудаваны новыя жылыя дамы і ўся неабходная сацыяльная інфраструктура. На гэтыя мэты мы выдаткавалі больш за адзін мільярд рублёў», — праінфармаваў ён.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што «Астравец павінен стаць прыкладам далейшага развіцця раённых цэнтраў». «Яны дагледжаныя, прыгожыя, але ў нечым састарэлыя. ***Мы нічога не будзем разбіраць. Мы створым там такія аб'екты сацыяльнай, вытворчай структуры, якія створаны ў выдатным горадзе Астраўцы»,*** — заявіў ён.

ТАКАЯ ПАЛІТЫКА НЕ ДЛЯ НАС

Будаўніцтва АЭС стала адной з прычын негатыўных выказванняў аб Беларусі з боку заходніх суседзяў — Літвы і Польшчы, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Ра-

зам з тым, па яго словах, кіраўніцтва Польшчы таксама хоча пабудаваць у сябе атамныя станцыі з дапамогай ЗША, але не выказвае гучна сваіх жаданняў. Літву ён назваў «затычкай пад усе дзіркі, па станцыі ў тым ліку». «Мяне часта крытыкуюць, што я доўга працую Прэзідэнтам. У гэтым ёсць свае плюсы. Яны заключаюцца ў тым, што я бачыў рэвалюцыю ў Літве, бачыў бардак пасля і да распаду Савецкага Саюза. Я ведаю, што такое Ігналінская станцыя (спыненая АЭС у Літве. — **«Зв.»**), я там быў. І будучы ў вышэйшым органе ўлады, калі не было яшчэ прэзідэнцтва, я бываў на Ігналінскай станцыі. Мы ніколі не прад'яўлялі літоўцам сваіх прэтэнзій», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што Літва брала ў Беларусі ваду для ахаладжэння сваёй станцыі, а пасля яму раілі перакрыць гэту магчымасць для Ігналінскай АЭС. Аляксандр Лукашэнка тады не згадзіўся, бо з павагай адносіўся да літоўцаў. «Захацелі яны быць у Еўрасаюзе — закрылі сваю станцыю, хоць нядрэнная была станцыя, забяспечвала Літву. Можна было з расіянамі яе мадэрнізаваць, адрамантаваць, як гэта робяць армяне, наколькі я ведаю. Яны пабеглі ў Еўрасаюз, ім прад'явілі прэтэнзію: «Закрывайце, у нас свайго барахла хапае». Яны і закрылі. Дык чаго да нас сёння прад'яўляеце прэтэнзіі?» — задаў пытанне кіраўнік Беларусі.

Ён дадаў: калі б не сапсаваныя адносіны, Беларусь гатова была б узяць на сваю станцыю незапатрабаваных у Літве спецыялістаў у ядзернай энергетыцы.

«З Еўрасаюза падштурхнулі, давайце, бамбіце: «Станцыя небяспечная, станцыя дрэнная». І пайшло, а чаму? Мы сёння канкурэнты заходнім краінам. Ім непатрэбная гэта станцыя, як непатрэбная і спакойная Беларусь», — лічыць Прэзідэнт.

Па яго словах, пабудаваўшы сваю станцыю, Беларусь не зрабіла нечага такога, што не робяць іншыя. АЭС будуе Фінляндыя, шмат іх у Расіі, ёсць ва Украіне, рыхтуецца Польшча, як сказаў Прэзідэнт, «ды і Літва ўжо заяўляе, што хоча пабудаваць».

«Мы чым горшыя? Калі бяспека — дык мы акружаны гэтымі энергаблокамі, ды старымі энергаблокамі. ***У нас дасканалы энергаблок, самы сучасны.*** Мы чаго павінны баяцца? МАГАТЭ тут кантралявалі пастаянна. Запрашалі літоўцаў... Канкурэнцыя, зайздрасць, нянавісць да таго, што адбываецца на нашай зямлі, — бачыць адказ Аляксандр Лукашэнка. — ***Гэта палітыка не для нас».***

З пляцоўкі станцыі ён яшчэ раз прапанаваў літоўцам быць нам сябрамі, працаваць разам, а не спрачацца. «Тое ж самае я хачу сказаць і кіраўніцтву Польшчы: нічога ў вас не атрымаецца. Мы не ўстанем на калені. Мы адкажам, нават калі застанёмся адны ў акружэнні, мы адкажам. Думаю, яны гэта зразумелі», — рэзюмаваў тэму Прэзідэнт.

ПАКАЛЕННЕ, ЯКОМУ ЁСЦЬ ШТО ПАКІНУЦЬ

Прэзідэнт канстатаваў, што сёння ў краіне адбываецца змена пакалення. Ён заклікаў прайсці гэты перыяд прыгожа, «бо зламаць проста, а аднавіць будзе складана, магчыма і не атрымаецца».

«Нашаму пакаленню не соромна перад тымі, хто прыйдзе за намі. У цяжкіх умовах пасля распаду Савецкага Саюза, калі па талонах і купонах дзялілі кавалак хлеба і каўбасы ў Беларусі, мы сталі дзяржавай касмічнай. Мы праніклі ў космас і сталі ў шэраг з касмічнымі дзяржавамі разам з братамі-расіянамі», — ацаніў пройдзены шлях Прэзідэнт.

У ліку дасягненняў сучаснай Беларусі ён назваў развіты IT-сектар і біятэхналагічную кампанію (БНБК), сучасную сельскагаспадарчую вытворчасць, якая сёлета выканала асаблівую ролю ў эканоміцы.

«Калі Еўропа сёння абрынецца па ВУП да 20 працэнтаў у сувязі з пандэміяй і іншым, мы змагаемся, каб ні аднаго працэнта не страціць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Зямлю і людзей ён назваў найвялікшай каштоўнасцю нашай дзяржавы, якую неабходна берагчы.

«Нашаму пакаленню не соромна, выходзячы з палітыкі, эканомікі, перадаць вам, маладому пакаленню і прад'явіць вам тое, што мы стварылі. Самае галоўнае — мы перадаём нашым дзецям, унукам суверэнную, незалежную краіну. Упершыню ў нашай гісторыі мы маем сваю дзяржаву, з усімі атрыбутамі, прыгожую, чыстую, як гэта было раней, як ёсць зараз і як будзе заўсёды», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«ПАВАЖАЮЦЬ У СВЕЦЕ ТОЛЬКІ МОЦНЫХ»

Кіраўнік дзяржавы адказаў на некалькі пытанняў журналістаў. Адно з іх датычылася рэакцыі міжнародных арганізацый на тое, як праходзяць прэзідэнцкія выбары ў ЗША, і ўплыву іх вынікаў на беларуска-амерыканскія адносіны.

Аляксандр Лукашэнка лічыць: якімі б вынікі выбараў у Злучаных Штатах Амерыцы ні былі, яны не паўплываюць на адносіны гэтай дзяржавы да Беларусі.

«ЗАПУСК НОВАЙ ЛІНІІ МЕТРО — ПАКАЗЧЫК САЦЫЯЛЬНАЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ УСТОЙЛІВАСЦІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Штодня паслугамі метрапалітэна карыстаецца больш за 700 тысяч пасажыраў — траціна ўсяго пасажырапатоку Мінска, праінфармаваў Прэзідэнт. Новая лінія яшчэ больш павялічыць гэту колькасць і злучыць праз цэнтр горада паўднёвыя і паўночныя раёны сталіцы.

ЭКАНАМІЧНА І ФУНКЦЫЯНАЛЬНА

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў праекціроўшчыкам і будаўнікам за хуткае выкананне, якасць работы і адпаведнасць сучасным стандартам, эстэтыку афармлення станцый і глыбокі сэнс, які закладзены ў іх вонкавае афармленне.

«Гэта хачу адзначыць асобна. Некалі я патрабаваў ад метрабудаўнікоў, дзясятак гадоў таму, каб мы пад зямлёй не стваралі музеі, — растлумачыў ён. — Гэта вельмі дорага. Мы і так плацім па 80 мільёнаў долараў за кожны кіламетр праходкі. Калі ў цэлым узяць аздабленне і праходку. Таму музеі ствараць не трэба, але станцыі павінны быць функцыянальныя і сімпатычныя, эстэтычныя, прыгожыя». Адзначыў Прэзідэнт і бяспеку трэцяй лініі — абсталяванне ахоўнымі агароджамі з празрыстага шкла.

«На будаўніцтве першай чаргі было задзейнічана больш за 3000 чалавек. Усім дзякуй, хто будаваў, вы сапраўдныя стваральнікі, бо працуеце на карысць людзей. Можа быць не ўсе сёння гэта ацэньваюць, але пройдзе няшмат часу, і ўсе годна ацэняць. У гэты складаны год нічога не спыніла вас: ні пандэмія, ні заклікі да забастоўкі. Таму што вы былі занятыя справай, як і большасць беларусаў, дзякуючы якім краіна жыве, развіваецца, становіцца прыгажэйшай і больш утульнай, — сказаў ён. — Так будзе заўсёды, нават калі некаму гэтага не хочацца».

Прэзідэнт дадаў, што сённяшні запуск першай чаргі новай лініі метро — гэта паказчык сацыяльнай і палітычнай устойлівасці.

«У гэты час такія дзяржавы, як мы, падобных аб'ектаў не ствараюць. Такіх, як вы — працавітых і сумленных людзей, у нашай краіне абсалютная большасць, — не сумняваецца кіраўнік дзяржавы. — Ды і тыя, хто яшчэ ўчора вагаўся, ужо ўбачылі твар майдану ў красе, зрабілі адпаведныя вынікі і ўжо патрабуюць ад мяне навесці парадак. Разумныя людзі хочуць бяспекі, стабільнасці і эвалюцыйнага развіцця, спакойных перамен, якія вы зможаце вытрымаць. Не забывайце, перамены — гэта сур'ёзная ломка. Пытанне толькі ў тым, гэта будзе ломка кардынальная або эвалюцыйная, спакойная. Да якой ломкі вы гатовыя, тая і будзе».

Кіраўнік дзяржавы рэзюмаваў, што падобна сучасным цягнікам, якія з гэтага дня пойдуць па новай лініі метро, жыццё Беларусі таксама пойдзе далей, да новых мэт.

ЗАХАВАЛІ КАШТОЎНУЮ ШКОЛУ

У гутарцы з метрабудаўнікамі Прэзідэнт расказаў, як некалі яму прыйшлося прымаць рашэнне: працягваць развіццё гэтага віду транспарту ці не. Ён нагадаў, што ў сярэдзіне 90-х была ідэя спыніць у Мінску будаўніцтва метрапалітэна. «Мной было прынятае рашэнне, якім я ганарыся, — прызнаўся ён. — Я сказаў: метро ў нас будзе. Метрабуд мы разбураць не станем». Прэзідэнт дадаў, што ў тыя гады пашкадаваў «метрабудаўцаў і тую школу, якая ў Беларусі была створаная». «Бо няшмат гарадоў у свеце будавалі тады і будуюць зараз метро. Мне стала шкада: калі мы спынім будаўніцтва, не стане гэтай школы, а гэта параўнальна з космасам, толькі пад зямлёй. Правільна сказалі вашы кіраўнікі, гэта — вышэйшы ўзровень будаўніцтва. Тут інавацыя, тут самыя новыя тэхналогіі. Адсюль, з-пад зямлі, будаўнікі наверсе, на зямлі, бяруць новыя метады», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт яшчэ раз павіншаваў метрабудаўнікоў з адкрыццём новых станцый. «Вельмі хачу, каб мы захавалі вас — разумных, талковых, таленавітых. Гэта не дзеля таго сказана, каб вас пахваліць. Вы сапраўды класныя спецыялісты. Таму трымайце сваю галаву ў руках і думайце, як жыць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

ШЛЯХ НА ПОЎДЗЕНЬ

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў расказаў Прэзідэнту пра перспектывы развіцця метро ў сталіцы. Па яго словах, акрамя чатырох адкрытых станцый, далейшыя планы — увядзенне станцыі «Аэрадромная».

«Там ужо вядуцца работы. У сакавіку ў бетоне яна будзе гатова і будзем перадаваць на аздабленне. На станцыі «Немаршанскі сад» таксама вядуцца работы, і ў верасні будзем аддаваць пад аздабленне. Далей — будаўніцтва станцыі «Слуцкі гасцінец», — паведаміў мэр.

У 2024 годзе, калі па планах будуць скончаны работы па пракладцы метро на поўдзень горада, зоймуцца будаўніцтвам лініі падземкі ў паўночным напрамку Мінска.

Фота Яна ХВЕДЫНЧА.

Прэзідэнт паставіў метрабудаўнікам задачу асвойваць і наземнае метро: «Нам трэба «выскачыць» за Уручча, там выйсці наверх і ісці за Смалявічы».

Па словах спецыялістаў, яны ўжо разглядаюць такія магчымасці (калі падземнае метро выходзіць на паверхню і ідзе як звычайная электрычка), выкарыстоўваючы сусветную практыку.

СПРАВА Ў БАТАРЭІ

Натуральна, што ў метро зайшла гутарка пра электратранспарт.

«У Мінску ад рухавікоў унутранага згарання трэба сыходзіць. Мінск трэба спакойна, без тэрміновых паказчыкаў, паступова пераводзіць на электратранспарт, бо атручваем людзей», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Важная ўмова развіцця электратранспарту — кошт батарэі. Як расказаў мэр Мінска Уладзімір Кухараў, «МАЗ» і «Белкамунмаш» вырабляюць свае батарэі для хуткай і доўгатэрміновай зарадкі тэхнікі: «І ўжо ўвесь транспарт будзе беларускімі батарэямі забяспечаны».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, асаблівую ўвагу з вясны будучага года трэба звярнуць на трамвайны рух. «Трэба прывесці ў парадак трамвайныя пуці, каб яны былі бясшумныя. Добрыя ж трамваі вырабляем, і гэта добры транспарт. Трамвайныя пуці трэба прыводзіць у парадак, пачынаючы ад цэнтра. Трамвай — гэта будучае», — адзначыў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што такія планы актуальныя і з нагоды адкрыцця Беларускай атамнай станцыі. «Электраэнергіі будзе дастаткова. Нашы прадпрыемствы плачуць, што няма куды яе падзець. Слухайце, як няма куды падзець электраэнергію? Нам яшчэ трэба адну такую станцыю пабудаваць, каб адысці ад залежнасці па вуглевадародах», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

МАЗГІ ВАЖНЕЙШЫЯ ЗА ТРУБУ

Для Прэзідэнта і вышэйшых службовых асоб правялі экскурсію па новых станцыях мінскай падземкі.

Падчас агляду Уладзімір Кухараў звярнуў увагу Прэзідэнта, што ўпершыню на новых станцыях Мінскага метрапалітэна ўстанавілі беларускія эскалатары. Іх паставіла прадпрыемства з Салігорска.

Перамяшчаліся паміж станцыямі высокія госці на цягніках М-110, выраблених ЗАТ «Штадлер Мінск» спецыяльна для трэцяй веткі сталічнага метро. Цягніковы састаў зганданай мадэлі мае не толькі выдатныя тэхніка-эканамічныя паказчыкі, але і палепшаныя спажывецкія характарыстыкі — зніжаны ўзровень шуму, кандыцыянаванне паветра.

«Добрая машына, ідзе мякка. Хто б мог думаць: эскалатары свае, усё сваё і цягнік свой!» — парадаваўся кіраўнік краіны.

Прэзідэнт выказаў думку, што беларускія спецыялісты могуць ствараць многае: ад прадуктаў харчавання да буйных інфраструктурных праектаў.

«Я думаю, што ж лепей для краіны: калі ў яе мора вуглевадародаў ці тое, што там могуць усё вырабіць? Калі ты ўмееш усё рабіць — за гэтым будучыня. Вуглевадароды сыдуць, атамныя станцыі, ветракі, сонечную энергію — знойдзем. А вось кампетэнцыі, мазгі — гэта галоўнае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«ПЕНСІЯНЕРЫ — ГЭТА СВЯТОЕ»

Зайшла гутарка і пра падтрымку пенсіянераў. Напярэдадні Прэзідэнт Беларусі падпісаў указ аб павышэнні пенсій.

«Абавязкова трэба дапамагчы пенсіянерам, ветэранам. Гэта наша апора, яны аказаліся апорай у гэты момант, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я ўчора падпісаў указ аб павышэнні (хоць трошкі) пенсій, каб рэальныя пенсіі не ўпалі. Пенсіянеры — гэта святое. Яны не могуць сабе зарабіць больш грошай, яны ўжо выпрацавалі свой час. Мы іх павінны падтрымліваць, як бы ні было цяжка».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Марыя ДАДАЛКА.

«Ні папярэдні прэзідэнт, ні новы на карце не пакажа нашу краіну, — адказаў ён. — Амерыканцы, вы ж ведаеце, яны пагружаныя ў свае праблемы. Калі знешняя палітыка, то гэта абавязкова крэйсеры, авіяносцы, гэта бомбы, снарады, ракеты — гэта іх знешняя палітыка перш за ўсё... Я не чакаю, што сітуацыя памяняецца ў нашых аднасінах».

Да таго ж, далёка не ўсё прэзідэнту ЗША ўдаецца зрабіць з яго намераў, заўважыў Аляксандр Лукашэнка, што тлумачыцца сістэмай кіравання гэтай краінай. «Ну а галоўнае — апора дэмакратыі — паглядзіце, што робіцца з гэтымі выбарамі! — эмацыянальна працягнуў ён. — Гэта ж ганьба! Гэта здзек з гэтай дэмакратыі. У чым яны нас папракалі і могуць папракнуць — у парушэнні нейкіх дэмакратычных прынцыпаў. Ну дык мы глядзім на вас! І вельмі правільна зададзена — рытарычнае — пытанне: ну паглядзім, як АБСЕ на гэта адрэагуюць. І як нямецкі парламент запатрабуе паўторных выбараў у Амерыцы. А там ужо сёння трэба патрабаваць паўторных выбараў, бо там парушанае было ўсё, нават унутранае заканадаўства».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што патрабаванне правесці паўторныя выбары ў Беларусі ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі беспрадметнае хоць бы таму, што такіх стандартаў, па яго словах, не існуе. «Іх няма. І мы з расіянамі ў АБСЕ прапаноўвалі выпрацаваць вось гэтыя міжнародныя стандарты, каб яны былі для ўсіх членаў АБСЕ, у тым ліку ЗША і Канада ўваходзяць туды, каб былі агульныя гэтыя стандарты па выбарах — яны абверглі зусім, — расказаў ён. — А сёння ад нас патрабуюць нейкіх дэмакратычных, усветных, агульнапрызнаных стандартаў. Іх няма».

Да слова кіраўнік дзяржавы пракаментаваў прынясце санкцый уласна супраць яго: «Паслухайце, я пад санкцыямі чвэрць стагоддзя жыў і здаровы. Я не паруся, як моладзь кажа, з гэтай нагоды...»

Разам з тым, Прэзідэнт упэўнены, што рэакцыі міжнародных арганізацый на працэс і вынікі выбараў у ЗША не будзе, нягледзячы на ўсе відавочныя, па яго словах, парушэнні. Аднак, сёлетнія выбары ў Амерыцы, на думку Аляксандра Лукашэнкі, — нагода задумацца ўсім, хто падтрымлівае пратэсты ў Беларусі.

«Добра, што мы ўбачылі сутнасць гэтай дэмакратыі — гэта балбатня. І лозунг: «Дэмакратыя, дэмакратыя!» Ніякай дэмакратыі няма. Паважаюць у свеце толькі моцных і толькі тых, хто можа стаяць намертва. Мы будзем стаяць», — запэўніў ён.

«КАНСТЫТУЦЫЮ НА ВУЛІЦЫ НЕ НАПІШАШ»

Другое пытанне журналістаў датычылася работы дыялогавых пляцовак у краіне.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што сам быў ініцыятарам і прыхільнікам падобнага фармату ўзаемадзеяння ў грамадстве.

«Тут, ведаеце, некаторыя пачалі вельмі актыўна працаваць, і ўсе пачалі працаваць наверсе: у парламенце, у Мінску, ледзь не на вуліцах з пратэстунамі. Я тады сказаў, што дыялогавыя пляцоўкі павінны быць і ў працоўных калектывах, і ў студэнцкіх калектывах, нават я гатовы да такіх дыялогаў. Я прапанаваў: давайце ніжэй апусцім гэтыя дыялогавыя пляцоўкі, каб людзі не проста пагаварылі, а ўнеслі свае прапановы. А мы адчулі, чым жыве народ», — нагадаў Прэзідэнт.

Адносна Канстытуцыі ён сказаў: «Ды не пытанне! Мы над ёй працуем два гады. ***Былі ўжо два праекты Канстытуцыі, я іх адхіліў, бо яны былі надта мяккія, не адпавядалі запытам, скажам так, перадавой часткі нашага грамадства. І я прапанаваў, каб змены былі больш радыкальныя, і мы падышлі да трэцяга варыянта».***

Тут няма і не можа быць ніякага падштурхоўвання збоку, у тым ліку ад кіраўніцтва Расіі, абурыўся кіраўнік дзяржавы: «Яны ніколі не ўмешваліся ў нашы справы. ***Лукашэнку ніхто ніколі не штурхаў за чвэрць стагоддзя і нікуды не штурхне. І гэта ўсе павінны цудоўна разумець».***

Тэма змянення Канстытуцыі займае на дыялогавых пляцоўках меншую частку часу, чым іншыя пытанні, якія хвалююць людзей, дадаў Прэзідэнт.

«Мы зараз фарміруем план далейшых нашых дзеянняў і збіраем усю гэтую інфармацыю. Калі мы яе збяром да Усебеларускага народнага сходу (засталося ж усяго пару месяцаў), мы яе павінны тут абмеркаваць, з экспертамі, і ўжо, магчыма, накідаць новы праект Канстытуцыі. Але для гэтага трэба стварыць новую рабочую групу, што я зараз і раблю, — паведаміў беларускі лідар. — ***Канстытуцыю, як я казаў, у СІЗА і на вуліцы не напішаш. Гэта найскладанейшы дакумент, навуковы, які павінны стварыць спецыялісты. Але спецыялістам патрэбны заказ ад нашага грамадства. А заказ — гэта тыя праблемы, якія мы падымем знізу».***

Дыялогавыя пляцоўкі, на думку Прэзідэнта, уцягваюць мільёны людзей не толькі ў абмеркаванне будучай Канстытуцыі, але і ў яе фарміраванне, фактычна — напісанне.

«Таму гэта вялікі наш набытак і вопыт — стварэнне дыялогавых пляцовак. Але яшчэ раз падкрэсліваю, вось паверце — будзе толькі так, як захоча наш народ. Ніякай фальсіфікацыі не будзе. ***Якую Канстытуцыю прыме народ, такая і будзе, такое будзе наша жыццё і такая будзе наша ўлада».*** — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Марыя ДАДАЛКА, г. Астравец.

ЗА МІР, СПАКОЙ, СТАБІЛЬНАСЦЬ

Учора аўтапрабег «За адзіную Беларусь!», які ўжо па выхадных стаў добрай традыцыяй, прайшоў па Мінскай кальцавой дарозе. Яго ўдзельнікі, што з'ехаліся з усёй краіны, на машынах, упрыгожаных дзяржаўнай сімволікай, праехалі па крузе вакол сталіцы. Да гэтага аўтапрабег пабываў ва ўсіх абласных цэнтрах нашай краіны.

І мы там былі

Ціха, з камфортам і бяспекай

Карэспандэнты «Звязды» праехаліся па новых станцыях метро ў дзень іх адкрыцця

7 лістапада ў 12.30 адбылася эпахальная для сталіцы падзея. Для пасажыраў адкрылася трэцяя лінія метрапалітэна. Першыя цягнікі адправіліся са станцый «Юбілейная плошча» і «Кавальская Слабада». Паміж імі — яшчэ дзве станцыі: «Вакзальная» і «Плошча Францішка Багушэвіча».

Новыя цягнікі куды больш ціхія за сваіх папярэднікаў. Таму пра тое, што састаў пад'язджае да платформы, паведаміць святлодыёдная індыкацыя на платформенных дзвярах.

Цікаўлюся: ці можа быць так, што цягнік прыедзе, а платформенныя дзверы не адчыняцца? І атрымаецца так, што прылада, скіраваная на тое, каб не было падзенняў на рэйкі, будзе

— Па нашым графіку мяркуецца, што ў будні будуць працаваць пяць цягнікоў, у выхадныя — чатыры. Інтэрвал руху ў будні складзе 5-6 хвілін у гадзіну пік. Па суботах і нядзелях — 8, — расказвае **начальнік службы руху Мінскага метрапалітэна Ігар ДАДАЛКА.**

Трэцяя лінія сталічнага метрапалітэна ўкамплектавана новым рухомым саставам айчыннай вытворчасці. Яшчэ адна асаблівасць — платформенныя дзверы, змацаваныя на ўсіх станцыях. Такім чынам, упасці на рэйкі тут немагчыма. Гэтым новая лінія кардынальна адрозніваецца ад першых дзвюх.

Ад «Кавальскай Слабады» да «Юбілейнай плошчы» цягнік рухаецца 6-7 хвілін. На першы погляд, гэта няшмат. Але калі ўлічыць, што першая чарга складаецца ўсяго з чатырох станцый, то такі паказчык цалкам нармальны.

— Цягнікі на трэцяй лініі будуць складацца з чатырох вагонаў. Гэта планавалася, зыходзячы з пасажырапатоку. Але калі лінія будзе падоўжана, то разгледзім пытанне і аб набыцці пяцівагонных саставаў.

Адначасова з тым у мінскім метро тытул самай глыбокай станцыі сышоў да «Юбілейнай плошчы». Ад паверхні зямлі трэба пераадолець 32 метры, каб трапіць на перон. Эскалатар едзе прыблізна 45 секундаў. Для неспрактыкаванага вока — незвычайна. У сваю чаргу, шырыня «Вакзальнай» складае нязвыклыя шаснаццаць метраў. Ёсць дзе павярнуцца з сумкамі!

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Для павышэння якасці прагнозаў

Метэаралагічны радыёлакатар урачыста адкрылі ў брэсцкім аэрапорце.

Установка радыёлакатара была прадугледжана Планам мерапрыемстваў па павышэнні якасці прагназавання надвор'я на кароткатэрміновую і доўгатэрміновую перспектывы на 2018—2020 гады, які рэалізуе Мінпрыроды па даручэнні Прэзідэнта. У віцебскім аэрапорце такая ўстаноўка з'явілася яшчэ ў снежні 2018 года, у гродзенскім — летам гэтага года. Ёсць яны ў Мінску і Гомелі.

Фота БелТА.

Такім чынам, адкрыццё аб'екта ў Брэсце стала фінальным акордам у справе стварэння сеткі радыёлакацыйных назіранняў у аэрапортах краіны. Гэта паслужыць павышэнню якасці прагназавання надвор'я і паляпшэнню абслугоўвання спажыўцоў.

Падчас адкрыцця **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалай ПІРШТУК** адзначыў, што стварэнне радыёлакацыйнай сеткі вельмі важнае для ваеннай і грамадзянскай авіяцыі, для многіх галін народнай гаспадаркі, якія ў паўсядзённым жыцці маюць справу са штормамі, навальніцамі, шквалістымі вятрамі. Паводле яго слоў, узровень абсталявання вельмі высокі і не саступае еўрапейскім узорам. Упершыню за 30 гадоў у краіне рэалізаваны такі праект. Кошт абсталявання ў Брэсце разам з установкай склаў каля пяці мільёнаў рублёў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Новы харчовы рынак у Валяр'янаве...

Новы харчовы рынак адкрыўся 7 лістапада на плошчах гандлёвага комплексу «Валяр'янава» Мінскага раёна. Аб'ект знаходзіцца на аўтатрасе М3 на выездзе са сталіцы па Лагойскім тракце. Ён з'явіўся на месцы дзесяцігадовага даўгабуда.

Рынак разлічаны на 140 гандлёвых месцаў, тут створаны ўсе ўмовы для продажу фермерамі, вытворцамі і гастраэнтузіястамі ўсіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Тут жа абсталяваны зручныя месцы для рэалізацыі прадукцыі фізічнымі асобамі, якія вырабілі або вырасцілі яе на ўласных падворках.

На рынку таксама будуць працаваць фірменныя магазіны найбуйнейшых вытворцаў харчавання Мінскай вобласці.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Наваселлі ў Мазыры

Напярэдадні Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі ў райцэнтры быў адкрыты новы жылы дом.

Адсвяткаваць навасэлле цяпер змогуць 176 сем'яў. Больш за 40 з іх пабудавалі жыллё з дзяржпадтрымкай. На наступны год намечана здача яшчэ аднаго падобнага 176-кватэрнага дома, які будуецца насупраць.

Між тым уходзіны адсвяткавалі і ў спартыўным комплексе спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 2 горада Мазыра.

— Мы не проста адкрываем пасля рамонту спартыўны комплекс, мы адкрываем спартыўную базу для школы алімпійскага рэзерву, дзе будуць рыхтаваць прызёраў спаборніцтваў розных узроўняў, — падкрэсліў падчас цырымоніі **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** — Не менш важна, што ў свабодны ад трэніровак час тут прадугледжаныя фізкультурна-аздараўленчыя заняткі для ўмацавання здароўя жыхароў горада і раёна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Лячэнне — больш інтэнсіўнае і тэхналагічнае

У Мінскім гарадскім клінічным анкалагічным дыспансеры адкрыўся радыелагічны корпус.

Фота Яны ХВЕДЧЫНА

«Здароўе нашых людзей — прыярытэтны кірунак сацыяльнай палітыкі Беларусі. Сёння дзяржава робіць усё для таго, каб такія ўстановы ў нашай краіне з'яўляліся», — сказала **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА,** якая ўдзельнічала ва ўрачыстым адкрыцці.

Паводле яе слоў, задачу дабудаваць новы корпус і тым самым стварыць у дыспансеры магчымасці для дыягностыкі і лячэння поўнага цыкла яшчэ ў 2017 годзе паставіў Прэзідэнт, адкрываючы адзін з карпусоў гэтай лячэбнай установы. «Сёння тут установлена высокатэхналагічнае абсталяванне, аналагаў якому ў такім аб'ёме няма на постсавецкай прасторы. Шэсць лінейных паскаральнікаў дазваляюць аказваць якасную, кваліфікаваную дапамогу пацыентам з усёй краіны», — адзначыла старшыня Савета Рэспублікі.

Як расказаў **галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Віктар КАНДРАТОВІЧ,** высокатэхналагічнае абсталяванне, якое ўстаноўлена тут, дазволіць праводзіць дыягнастычныя даследаванні, лячэнне і аперацыі любой складанасці. У гэтым корпусе будуць размешчаны 240 пацыентаў. «З уводам новага корпуса ў нас дадаецца ўсяго толькі 20 ложкаў. Гэта сведчыць аб тым, што мы проста паляпшаем становішча нашых пацыентаў, іх знаходжанне ў стацыянары. І асноўны сэнс гэтага корпуса ў тым, што ён нясе тэхналагічнасць. Лячэнне будзе больш інтэнсіўнае, больш тэхналагічнае», — рэзюмаваў ён.

Фота БелТА.

Плюс 650 рабочых месцаў

Запушчана вытворчасць халоднакатанага ліста на Мёрскім металапракатным заводзе.

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА, які ўдзельнічаў у запуску, адзначыў, што ў рабоце прадпрыемства задзейнічаны тэхналогіі, якіх да гэтага не было ў краіне, і падкрэсліў, што прадпрыемства ў Мёрах стала пазітыўным прыкладам узаемадзеяння дзяржавы і прыватнага інвестара.

Кіраўнік урада азнаёміўся з ходам завяршальных этапаў рэалізацыі інвестпраекта. Яму расказалі пра планы развіцця завода і рынкі збыту прадукцыі.

Вытворчая магутнасць Мёрскага завода на першым этапе складзе 50 тысяч тон халоднакатанага ліста ў год і 150 тысяч тон белай бляхі. На другім прадукцыйнасць вырасце да 240 тысяч тон. Беларусь у год спажывае да 30 тысяч тон бляхі, таму вялікая частка прадукцыі будзе экспартавацца. У завод укладзена больш за 360 млн еўра. Гэта інвестыцыі з Беларусі, ЕС і Расіі. На ўсю моц прадпрыемства павінна запрацаваць у снежні.

Генеральны дырэктар прадпрыемства Пётр ШЫМУКОВІЧ дадаў, што такой прадукцыі, якую будзе вырабляць завод, у Беларусі раней не было. «Адпаведна рынак нашай краіны і суседніх можа быць намі замешчаны», — сказаў гендырэктар.

Пётр Шымуковіч падкрэсліў, што завод важны для Мёрскага раёна, будзе спрыяць яго развіццю і стварэнню рабочых месцаў. На заводзе будзе працаваць каля 650 чалавек.

«Сонейка» на сучасны лад

Новы дзіцячы садок «Сонейка» на 190 месцаў адкрыўся ў Маскоўскім раёне Мінска.

У дзіцячым садку на вуліцы Міхалоўскай будзе 10 груп, дзве з іх — для малых ясельнага ўзросту. Яго пабудавалі за 11 месяцаў. Для дзяцей тут ёсць камп'ютарная гульнявая, басейн, зала для заняткаў фізкультурай, медыцынскі блок з кабінетам дэфектолага. Абсталяваны пры ўдзеле МНС міні-цэнтр бяспекі.

Як адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА,** які прымаў удзел у адкрыцці, толькі за апошнія пяць гадоў у Беларусі ўвялі 77 дашкольных устаноў. Сёлета адкрыта 16 дзіцячых садкоў, яшчэ адзін — у Фрунзенскім раёне Мінска — здадуць да канца года.

«У плане забяспечанасці дзіцячымі садкамі мы выконваем сацыяльныя стандарты ва ўсіх рэгіёнах краіны, за выключэннем Мінскага і Баранавіцкага раёнаў. Мы актыўна працуем, каб задаволіць патрэбу ў дзіцячых садках», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Паводле яго слоў, месцамі ў дашкольных установах забяспечана каля 47,7 % дзяцей ва ўзросце ад года да трох, для 98 % дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў ёсць месцы ў дзіцячых садках. Гэта вельмі сур'ёзныя і добрыя лічбы. Усё, што трэба ад дзяржавы, робіцца, мы забяспечваем дзіцячыя садкі па самым апошнім слове тэхнікі», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Фота БелТА.

Фінансы

Золатавалютныя рэзервы краіны склалі 7,5 мільярда долараў

Яны павялічыліся

Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на пачатак лістапада, паводле папярэдніх звестак, склалі 7 485,6 млн долараў ЗША (у эквіваленце). За мінулы кастрычнік рэзервы выраслі на 164,2 млн долараў (на 2,2 %) пасля зніжэння ў верасні на 136,4 млн долараў (на 1,8 %).

Як адзначылі ў прэс-службе Нацбанка, павелічэнню ўзроўню золатавалютных рэзерваў у кастрычніку спрыяла прыцягненне ўрадам знешняй пазыкі, а таксама купля Нацыянальным банкам замежнай валюты на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа». Варта нагадаць, што ў кастрычніку ўрадам выканана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 222 млн долараў.

Згодна з асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2020 год, аб'ём міжнародных рэзервовых актываў на 1 студзеня 2021 года павінен скласці не менш за 7,3 млрд долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона (оператор ЭТП)	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 46**
Продавец	**ОАО «БНБ-Банк», 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 87а**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**
Предмет электронных торгов	
№ лота	Наименование (Назначение)
1	**Обувь, реализуемая одним лотом, в количестве 28 272 пар.** Подробный перечень, подлежащий реализации, размещен на электронной площадке Ipmtorgi.by **Местонахождение:** Минский район, д. Большой Тростенец (Шабаны)
Начальная цена с НДС 20 % – 28 272,00 белорусских рублей	
